ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1984
29
ЛІСТАПАДА
ЧАЦВЕР
№ 33 (1446)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

"Беларускі універсітэт"

## тэлетайп

•Учора • Сёння • Заўтра•

### САВЕТ

БДУ імя У. І. Леніна на чарговым пасяджэнні абмеркаваў пытанне аб стане і далейшым развіцці мэтавай падрыхтоўкі спецыялістаў і навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва універсітэта з НДІ АН БССР, вытворчымі аб'яднаннямі і прадпрыемствамі рэспублікі. З дакладам па гэтаму пытанню выступіў прарэктар па вучэбнай рабоце прафесар Я. П. Пятраеў.

Была таксама разгледжана работа факультэтаў павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў ВНУ і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў.

З. АЛЯКСАНДРАВА.

### У ГОСЦІ

да студэнтаў факультэта журналістыкі прыйшоў старшыня Дзяржтэлерадыёкамітэта, народны паэт БССР Г. М. Бураўкін. Былы выпускнік журфака нядаўна вярнуўся з Балгарыі, дзе пабываў у саставе савецкай дэлегацыі на Міжнародным кінафестывалі.

Генадзь Мікалаевіч расказаў пра работу радыё- і тэлежурналістаў, пра патрабаванні, якія ставяцца перад маладымі спецыялістамі. Ён адзначыў, што галоўная ўвага звяртаецца на тое, каб будучыя журналісты добра ведалі жыццё, былі таленавітымі, мелі высокі прафесіяналізм.

Госць коратка спыніўся на характэрных асаблівасцях работы ў друку, на радыё і тэлебачанні. Калі газетчык працуе над сваім матэрыялам самастойна, то на радыё і тэлебачанні праца калектыўная. А гэта павялічвае адказнасць кожнага журналіста.

На сустрэчы былі абмеркаваны некаторыя тэле- і радыёперадачы, адзначаны найбольш удалыя.

У заключэнне паэт адказаў на пытанні студэнтаў і прачытаў некалькі вершаў са сваёй новай кнігі «Гняздо для птушкі радасці», якая выйдзе ў свет у наступным годзе.

Л. КАЗЛОВА,
студэнтка факультэта журналістыкі.

### МЕСЯЧНІК ПА ПРАПАГАНДЗЕ

і распаўсюджванню грамадска-палітычнай літаратуры, прысвечанай 40-годдзю Перамогі, праводзіцца ў кніжных магазінах горада.

Магазін № 19 «Метадычная кніга» прапануе наступныя выданні: Зіманас Г. А. «Вспомним поименно», Гурскі В. «Ля вытокаў Немана» (Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны), Чэлышаў Б. Д. «В поисках фронтовых писем», Адамовіч А. «Я з вогненнай вёскі».

Запрашаем выкладчыкаў і студэнтаў наведаць магазін і набыць неабходную літаратуру.

А. УЛАДЗІМІРАВА.

## КАМСАМОЛЬСКАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ




# СПЫТАЙ СЯБЕ СТРОГА

У жыцці кожнага камсамольца, бадай, няма падзеі больш важнай, чым справаздачна-выбарны сход. І не толькі таму, што тут падводзяцца вынікі работы за год, ставяцца планы на будучае, але і таму, што тут кожны камсамолец павінен спытаць сябе: ці ўсё я зрабіў для таго, каб насіць імя вялікага правадыра, ці змагаўся я за тое, каб жыццё камсамольскай арганізацыі было цікавым.

Студэнт прыходзіць у ВНУ, каб набываць веды, — аксіёма. Здавалася б, тут не павінна быць ніякіх праблем. Але іменна пытанне вучобы стала цэнтральным у дакладзе сакратара камітэта камсамола Аляксандра Казуліна на XXXI камсамольскай справаздачна-выбарнай канферэнцыі універсітэта.

Чаму гэтаму пытанню надавалася асаблівае значэнне? Справа ў тым, што ў параўнанні з мінулым годам ва універсітэце знізіўся ўзровень паспяховасці і зараз складае 91,6. Па-ранейшаму дрэнна здаюць сесіі студэнты 1—2-х курсаў. Усяго ва універсітэце 1.500 двоечнікаў і тых, хто займаецца толькі на «здавальняюча». І гэта ў той час, калі на пытаннях вучобы сканцэнтравана ўвага ўсяго прафесарска-выкладчыцкага саставу універсітэта, вучэбна-выхаваўчай камісіі. Пытаннямі вучобы займаецца каля тысячы камсамольскіх актывістаў.

— Дзе ж мы працуем у халастую? — задае пытанне Аляксандр Казулін і сам шукае на яго адказ: — Відаць, усе намаганні будуць дарэмнымі да таго часу, пакуль кожны студэнт не зразумее, што вучоба — гэта яго галоўны абавязак. Пакуль у групах не будзе створана атмасфера нецярпімасці да двоечнікаў і парушальнікаў дысцыпліны, датуль і будзе стаяць пытанне аб паспяховасці.

На трэцім курсе беларускага аддзялення філалагічнага факультэта яшчэ ў лістападзе пяць чалавек мелі запазычанні. Бюро курса не стала чакаць, а выклікала іх на пасяджэнне, строга спытала з камсоргаў. Там, дзе не застаюцца пасіўнымі назіральнікамі, там, дзе за кожнага камсамольца хварэе група, можна гаварыць аб пэўных выніках работы.

На канферэнцыі размова аб навукова-даследчай дзейнасці зайшла не выпадкова. 67 працэнтаў ад агульнай колькасці студэнтаў стацыянара займаюцца навукова-даследчай работай. Студэнты прымалі ўдзел у выкананні 54 працэнтаў дзяржбюджэтных і 59 працэнтаў гаспадарча-дагаворных НДР. Каля 500 студэнтаў працавалі на штатных пасадах. Па выніках навукова-даследчай работы студэнтамі было пададзена 20 заяў на вынаходствы. Яркія факты. Але ці можна быць задаволеным гэтым? Не. Ёсць выпадкі, калі самастойная праца студэнтаў падмяняецца апекай выкладчыкаў. Яшчэ далёка не ў кожнай групе зацікаўлена ставяцца да навуковай дзейнасці студэнтаў. Таму і вынікі гэтыя не могуць радаваць.

Па-ранейшаму вельмі балючым ва універсітэце застаецца пытанне «Хто гаспадар у інтэрнаце?» У апошні час значна знізіліся колькасць і якасць мерапрыемстваў, што не замарудзіла сказацца на маральным і эстэтычным выхаванні студэнтаў. Па падліках, за год мяняецца каля дзвюх тысяч крэслаў з агульнай колькасці шэсць тысяч. Як жа знайсці выхад з такога становішча? Цікавую думку выказаў Анатоль Дудкін, дэлегат ад камсамольскай арганізацыі юрыдычнага факультэта.

— Мы галасуем за самаўпраўленне.

— У чым яго сутнасць? З 1 лютага інтэрнат № 6 па ініцыятыве камітэта камсамола факультэта прыкладной матэматыкі пераходзіць на новую форму абслугоўвання. Гэта значыць, што ўсе віды работ: слясарныя, уборку памяшканняў, рамонт ліфтоў — будуць выконваць студэнты. А зароблены грошы будуць пералічвацца ў фонд інтэрната для набыцця апаратуры, тэлевізараў і г. д.

Камітэт камсамола універсітэта выходзіць з сустрэчнай прапановай: у час летніх канікулаў арганізаваць атрады, якія б сустракалі завочнікаў і абітурыентаў, а потым прымалі ад іх пакоі, выконвалі невялікі рамонт.

Відаць, такім чынам можна будзе навесці сапраўдны парадак у інтэрнаце.

— А я хачу пагаварыць пра СБА, пра арганізацыю будаўнічых атрадаў, месцы іх дыслакацыі, — так пачала сваё выступленне сакратар камітэта камсамола філалагічнага факультэта Ірына Крэтовіч. — Напэўна няма такога чалавека, які б не ведаў, што філалагічны факультэт на 99 працэнтаў жаночы. Таму і фарміруем мы жаночыя атрады. Аднак з камітэта камсамола універсітэта нечакана прыходзяць указанні: сфарміраваць два мужчынскія атрады. Перад нашым камітэтам камсамола паўстала няпростая задача. Як быць? Ёсць, праўда, у нас мужчынскі атрад, у якім аб'яднана ўся мужчынская палова філфака. Але ж атрад адзін. І тады нам зноў прапануюць: а вы яго падзяліце... на два. Давялося падзяліць. Да самага ад'езду атрады не ведалі месца дыслакацыі. У думках і ў Стаўрапалі пабывалі, і ў Малдавіі, і ў Беларусі.

А сёння я магу гаварыць аб выніках работы. Сумныя яны. Калі адзін атрад папрацаваў нішто сабе, то з другім мы яшчэ і сёння разбіраемся. Вось і ўзнікае пытанне: навошта рабіць такія змены? Складваецца ўражанне, што будатрад страціў сваю высокую місію — у яго едуць не самыя лепшыя, а наадварот: ён ператварыўся ў меру нейкага пакарання студэнтаў. Думаю, што камітэту камсамола патрэбна перагледзець пытанне аб арганізацыі будатрадаў.

Як бачна, шмат пытанняў было ўзнята на канферэнцыі. Ёсць тут над чым падумаць і камітэту камсамола універсітэта, і камітэтам камсамола факультэтаў, і камсоргам груп, кожнаму камсамольцу.

У рабоце канферэнцыі прынялі ўдзел загадчыца аддзела студэнцкай моладзі ЦК ЛКСМБ А. Я. Багданава, міністр вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР М. М. Мяшкоў, намеснік загадчыка аддзела навукі ЦК КПБ В. П. Кузьмянкоў, сакратар ЦК ЛКСМБ А. П. Хандогін, першы сакратар Маскоўскага РК КПБ Б. А. Саўчанка, загадчык аддзела навуковай моладзі АК ЛКСМБ В. К. Карагулькін, сакратар Мінскага ГК ЛКСМБ А. П. Начоўкіна, першы сакратар Маскоўскага РК ЛКСМБ А. П. Саламаха.

# КАМСАМОЛІЯ — НАША ІМЯ,

**МАТЭРЫЯЛЫ 2-й і 3-й СТАРОНАК ПРЫСВЕЧАНЫ V СПРАВАЗДАЧНА-ВЫБАРНАЙ КАМСАМОЛЬСКАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ МАСКОЎСКАГА РАЁНА ГОРАДА МІНСКА.**

## «АДЗІН — ЗА ЎСІХ...»

Мінскае вытворчае аб'яднанне «Прамень», закройны цэх. Праходжу ўздоўж станкоў, назіраю за руплівай працай рабочых.

Перад участкам — сцяг, на якім напісана: «Лепшаму камсамольска-маладзёжнаму калектыву».

Брыгадзір Алена Аляксееўна Чарняўская расказвала пра сябе неахвотна, загаралася толькі тады, калі гаварыла пра свой калектыў. Гэтая жанчына, раскройшчыца верху абутку, — дэпутат Вярхоўнага Савета БССР, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі за 1983 год, заслужаны работнік прамысловасці БССР.

Кожны год брыгада папаўняецца маладымі рабочымі. У асноўным гэта навучэнцы ГПТВ-43. Ад таго, як яны пачнуць свой працоўны шлях, залежыць іх далейшы лёс. Вось на іх і звяртае галоўную ўвагу брыгадзір.

— Я разам з Надзеяй Новік працую на фабрыцы толькі тры месяцы і вельмі рада, што трапіла ў такі дружны, зладжаны калектыў, — сказала нядаўняя выпускніца вучылішча Рая Юнак. І таму не выпадкова, што з першых дзён работы дзяўчаты не толькі выконваюць, але і перавыконваюць норму.

У брыгадзе Алены Аляксееўны пятнаццаць чалавек. У кожнага свой характар, свае інтарэсы. Вопытны кіраўнік ведае магчымасці амаль усіх. Таму і грамадская работа ў іх пастаўлена добра. Члены камсамольска - маладзёжнага калектыву актыўна ўдзельнічаюць не толькі ў жыцці брыгады, але і фабрыкі. Большая частка камсамольцаў — удзельнікі мастацкай самадзейнасці. Многія рэгулярна наведваюць эканамічныя гурткі, удзельнічаюць у конкурсах рабочага майстэрства маладых раскройшчыкаў.

Аб рабоце брыгады гаворыць той факт, што ў адзінаццатай пяцігодцы падраздзяленне двойчы выходзіла пераможцам сярод камсамольска-маладзёжных калектываў. Яны не толькі перавыконваюць план, але і ўзятыя індывідуальныя абавязацельствы. Так, за змену яны раскройваюць 960 пар абутку, і ўся прадукцыя ідзе са Знакам якасці. А ўсё гэта дзякуючы таму, што дзяўчаты не саромеюцца вучыцца адна ў адной, пераймаюць вопыт лепшых.

«Адзін — за ўсіх, усе — за аднаго» — пад такім дэвізам працуюць сёння члены брыгады Чарняўскай вытворчага аб'яднання «Прамень».

**Т. ТРАЦЦЯК,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**




«МЫ ГАЛАСУЕМ ЗА МІР!»

Фота В. Драчова.

ПРЫЗЁРАМ Усесаюзнага конкурсу ліцейшчыкаў у Ленінградзе ў мінулым годзе стала рабочая цэха № 11 Мінскага вытворчага аб'яднання «Прамень» Тамара Каралёва. Яна — ліцейшчык нізу абутку. Аперацыя, на якой працуе Тамара, з'яўляецца заключнай, а таму асабліва адказнай. Рабочая дасканала валодае сваёй прафесіяй.

Тамару Каралёву паважаюць у калектыве не толькі як выдатнага работніка вытворчасці, але і як чалавека. Добразычлівая, чулая дзяўчына актыўна ўдзельнічае ў грамадскім жыцці цэха. Яна — член цэхавага камітэта. А нядаўна камсамольцы цэха аказалі ёй вялікі давер — выбралі сакратаром камсамольскай арганізацыі, дэлегатам V раённай камсамольскай канферэнцыі.

Фота Б. Буслава.



## ГАЛОЎНАЕ — ЗАХОПЛЕНАСЦЬ

**У сярэдняй школе № 37 г. Мінска вялікая ўвага ўдзяляецца ваенна-патрыятычнаму выхаванню. Раней яно абмяжоўвалася ў асноўным сустрэчамі з ветэранамі і ўдзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны. Часам школьнікі наведвалі іх дома, дапамагалі ў хатніх справах, хадзілі ў магазін і г. д. Так было да 1981 года.**

**...Традыцыйна, напярэдадні 23 лютага, праходзіў парад школьнікаў, прысвечаны Дню Савецкай Арміі. У той год камандаваць парадам па ўласнай ініцыятыве прыехаў падпалкоўнік запасу І. Я. Мадэкін. А праз некалькі дзён Іван Якаўлевіч завітаў у школу зноў. На гэты раз ён прыйшоў з прапановай арганізаваць у школе музей баявой славы.**

**Аб тым, як збіраліся экспанаты, як паступова расшыраўся музей баявой славы 28-й гвардзейскай арміі, што створаны вучнямі 37-й мінскай школы, расказвае завуч па выхаваўчай рабоце, кіраўнік музея Людміла Адамаўна Шніткоўская:**

— Пры дапамозе І. Я. Мадэкіна пошукавая група школы звязалася з Мінскай секцыяй савета ветэранаў. Старшыня секцыі Ф. Т. Жаваранкаў прапанаваў школьнікам збіраць матэрыял аб 28-й Чырванасцяжнай арміі. Хлопчыкаў і дзяўчынак зацікавіла гэтая прапанова, тым больш, што І. Я. Мадэкін і Ф. Т. Жаваранкаў таксама прайшлі шлях ад Волгі да Берліна ў саставе гэтай арміі. Перш за ўсё вучні звязаліся з ветэранамі арміі, якія жывуць зараз у Мінску. І ўжо 1 верасня на Урок міру ў школу прыйшоў Герой Савецкага Саюза палкоўнік В. С. Мічурын.

Гэтым летам пашуковая група выязджала на месцы баёў арміі каля вёскі Азарычы. Было адшукана шмат рэчаў — сведкаў тых далёкіх ваенных часоў: нямецкі перадатчык, гільзы, тэлефон. Усе яны знайшлі свае месца на стэндах музея.

**І. КЕЗІК,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**

## ВЫСОКАЕ

Камсамолія раёна налічвае ў сваіх радах больш за 40 тысяч чалавек, з іх каля 6,5 тысячы рабочых, 24 тысячы студэнтаў і навучэнцаў, больш за 9,5 тысячы маладых вучоных, інжынераў і служачых.

Пачаткам грамадзянскага станаўлення была і застаецца праца. Моладзь раёна актыўна ўдзельнічае ў эканамічным эксперыменце, шэфствуе над будаўніцтвам важнейшых народнагаспадарчых аб'ектаў у прамысловасці і ў вёсцы, змагаецца за ўмацаванне працоўнай дысцыпліны, эканомію усіх відаў рэсурсаў. І ў тым, што ў раёне ў першым паўгоддзі амаль удвая скараціліся страты рабочага часу, знізілася цякучасць кадраў, на 14 працэнтаў паменшылася колькасць прагулаў — ёсць заслугі нашай камсамоліі.

З кожным годам шырыцца сярод моладзі рух за камуністычныя адносіны да працы. Сёння ў ім удзельнічае больш за 15 тысяч камсамольцаў і моладзі, больш за 2 тысячы носяць званне «Ударнік камуністычнай працы».

Актывізавалася работа па стварэнню камсамольска-маладзёжных калектываў. Іх у раёне 59.

Расшыраецца калектыўнае і індывідуальнае камсамольска-маладзёжнае спаборніцтва. У яго авангардзе — камсамольска-маладзёжная брыгада цэха № 2 Мінскага вытворчага абутковага аб'яднання «Прамень», брыгадзір — кавалер ордэна Знак Пашаны, дэпутат Вярхоўнага Савета БССР Алена Аляксееўна Чарняўская, камсамольская група цэха № 1 фабрыкі імя Куйбышава, групкамсорг Марына Гомельская. Трывала ўжываецца ў практыку работы прамысловых прадпрыемстваў стварэнне скразных брыгад выдатнай якасці, якія заключаюць дагаворы з буйнейшымі гандлёвымі арганізацыямі сталіцы. Такіх брыгад налічваецца ў раёне 27.

Ударная работа камсамольцаў і моладзі прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці дазволіла гэтым калектывам справіцца з задачамі, пастаўленымі эканамічным эксперыментам; выканаць планавыя заданні і сацыялістычныя абавязацельствы, цалкам забяспечыць выкананне дагаворных абавязацельстваў, больш чым на трэць павялічыць выпуск вырабаў з дзяржаўным Знакам якасці, знізіць сабекошт прадукцыі звыш плана амаль на 1,5 працэнта.

Пастаянную ўвагу РК ЛКСМБ удзяляе развіццю навукова-тэхнічнай творчасці юнакоў і дзяўчат. Практычным увасабленнем дэвіза «Рабочай ініцыятыве — інжынерную падтрымку» з'яўляецца работа маладых наватараў ВА «Мінмедпрэпараты». Вопыт камсамольскай арганізацыі па развіццю руху маладых рацыяналізатараў і вынаходнікаў адобраны бюро РК ЛКСМБ.

Актыўны ўклад у расшырэнне фундаментальных навуковых даследаванняў, укараненне дасягненняў навукі і тэхнікі ў вытворчасць уносіць двухтысячны атрад маладых вучоных і спецыялістаў раёна. Пацвярджэнне таму — прысуджэнне іх работам 5 прэмій Ленінскага камсамола Беларусі за 1982 год. Юнакамі і дзяўчатамі раёна за 1983 год пададзена 102 рацпрапановы і 200 заявак на вынаходніцтвы, 99 з іх укаранёны ў вытворчасць. Эканамічны эфект склаў 185 тысяч рублёў.

У раёне створана 10 навукова-вытворчых і вучэбна-вытворчых аб'яднанняў. У тым ліку такія, як БДУ — НДІ ПФП — ВА «Інтэграл», НДІ кардыялогіі — ВА «Інтэграл», што з'яўляецца практычным увасабленнем ініцыятывы перадавых прамысловых прадпрыемстваў горада «У саюзе навукі з вытворчасцю — кожнаму вырабу высокую якасць уклад у будаўніцтва важ-распрацоўкі».

Раённая камсамольская арганізацыя ўносіць свой нейшых народнагаспадарчых аб'ектаў у Цюмені, Камсамольску-на-Амуры, пасланцы моладзі раёна будуюць БАМ і «Атаммаш».

Ударнай справай раённай камсамольскай арганізацыі стала шэфства над будаўніцтвам станцыі метро «Плошча Леніна». На гэтай будоўлі працавалі звыш 20 тысяч камсамольцаў. Для будаўнікоў метрапалітэна сабрана бібліятэка, праводзіліся канцэрты, выступленні агітбрыгад.

У рабоце па ўзмацненню партыйнага кіраўніцтва камсамолам вялікая ўвага ўдзяляецца ідэйна-палітычнай загартоўцы моладзі, фарміраванню марксісцка-ленінскага светапогляду, класавага падыходу да з'яў

# НАША МЕСЦА — ПЯРЭДНІ КРАЙ



**У ЛІКУ дэлегатаў канферэнцыі — А. М. Макараў — рэгуліроўшчык радыёапаратуры завода «Калібр», сакратар камсамольскага бюро цэха. Ён неаднаразова выходзіў пераможцам спаборніцтва за званне «Лепшы малады рабочы», узнагароджаны памятным знакам «60 гадоў з імем Леніна», Ганаровай граматай ЦК ВЛКСМ.**



ЛІЛІЯ ВАЙШЭВІЧ — аперацыйная медыцынская сястра кардыяхірургічнага блока 4-й клінічнай бальніцы, дэлегат V раённай камсамольскай канферэнцыі, член камітэта камсамола клінікі, ударнік Камуністычнай працы.

● МЫ — ШЭФЫ ●

# СПРАВА ЎСІХ І КОЖНАГА

Выконваючы патрабаванні партыі, камсамольскія арганізацыі факультэта нашага інстытута актыўна ўдзельнічаюць у далейшым удасканаленні навучання, выхаванні, падрыхтоўцы да жыцця і працы навучэнцаў СШ № 146 г. Мінска, ГПТВ №№ 47, 52, Стальбоўскай, Зяньковіцкай, Неманскай, Азёрскай, Цяплінскай, Лашанскай, Дзешчанскай сярэдніх школ Уздзенскага раёна.

У СШ № 146 г. Мінска, ГПТВ №№ 47, 52 працуюць педагагічныя атрады (60 чалавек). Добра пастаўлена шэфская работа на санітарна-гігіенічным і стаматалагічным факультэтах, а вось у рабоце агітбрыгады педыятрычнага факультэта былі істотныя недахопы.

Патрабуе паляпшэння шэфская работа ў сярэдніх школах Уздзенскага раёна. Зрывы выездаў адбываліся з-за адсутнасці транспарту, хаця графікі выездаў былі складзены і зацверджаны загадзя. Аднак заўсёды знаходзілася іншая, больш неабходная справа, і выезд адкладваўся. Хочацца верыць, што ў гэтым годзе шэфства над школамі Уздзенскага раёна будзе наладжана.

Разам з тым педатрадамі факультэтаў праведзена значная работа ў падшэфных арганізацыях. У СШ № 146 педатрады лячэбнага і стаматалагічнага факультэтаў дапамаглі камсамольцам напісаць сцэнарый выступлення школьнай агітбрыгады, забяспечылі мастацкае афармленне, музычнае суправаджэнне, слайды. Замацаваны за падшэфнымі класамі піянерважатыя. Студэнтамі было прачытана 8 лекцый па медыцынскай тэматыцы, аформлены тры санбюлетэні.

Члены педатрада санітарна-гігіенічнага факультэта арганізавалі вечар-сустрэчу з навучэнцамі ГПТВ-47 у кафэ «Генезіс». У ГПТВ №№ 52, 47 прайшлі выступленні агітбрыгад, было прачытана 9 лекцый па разнастайнай тэматыцы, арганізаваны універсітэты здароўя і санкуткі, праводзілася сумесная вучоба камсамольскага актыву.

У падшэфных сярэдніх школах Уздзенскага раёна было дадзена 3 канцэрты, прачытана 6 лекцый, перададзена 3 санбюлетэні, папоўніліся школьныя бібліятэкі творамі У. І. Леніна, мастацкай літаратурай, спецыяльнай медыцынскай літаратурай. У падшэфных школах створаны бібліятэкі камсамольскага актыву.

Аддзелу шэфскіх сувязей камітэта камсамола Мінскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута патрэбна і надалей развіваць і ўдасканальваць сваю работу, дапамагаць будаваць жыццё атрадаў, дружын і камітэтаў камсамола змястоўна, падтрымліваць дух рамантыкі ў справах.

**С. СЯНЬКО,**
**намеснік сакратара камітэта камсамола МДМІ па шэфскай рабоце.**

# ПРЫЗВАННЕ

грамадскага жыцця. З дапамогай партыйных камітэтаў у раёне створана больш за 230 школ і семінараў камсамольскай палітвучобы, у якіх займаецца звыш 5 тысяч маладых рабочых. Прадуманая сістэма палітычнай і эканамічнай адукацыі дзейнічае ў камсамольскіх арганізацыях завода «Калібр».

Сёння стаіць задача сур'ёзна падняць узровень палітычнай вучобы моладзі. Павінна стаць правілам: лепшых прапагандыстаў — у камсамольскую палітасвету, лепшых лектараў — у маладзёжную аўдыторыю.

Класавая загартоўка моладзі — справа актуальная. У жыццё ўступаюць новыя пакаленні, якія не прайшлі школу класавай барацьбы, самае вострае праяўленне якой — вайна. Моладзь сёння — галоўны аб'ект ідэалагічных дыверсій. Разам з тым, контрпрапагандысцкай рабоце ў многіх працоўных калектывах, і асабліва ў навучальных установах, школах і ПТВ, не хапае наступальнасці і аператыўнасці. Некаторай частцы моладзі ўласціва праяўленне інфантылізму, пакланенне перад уяўнымі каштоўнасцямі буржуазнага ладу жыцця.

Усё гэта патрабуе ад партыйных і камсамольскіх арганізацый, усяго ідэалагічнага актыву ўзмацнення контрпрапагандысцкай работы.

Неабходна яшчэ шырэй развіваць работу па ваенна-патрыятычнаму выхаванню. Гэтаму павінна садзейнічаць падрыхтоўка да 40-годдзя Перамогі савецкага народа.

Большасць праблем выхавання моладзі цесна звязаны з арганізацыяй адпачынку. У раёне ёсць нядрэнная матэрыяльная база культурна-масавай работы, створана больш за 100 калектываў мастацкай самадзейнасці, у якіх займаецца каля 4 тысяч юнакоў і дзяўчат. Працуюць 4 дыскатэкі. Дыскатэка «Рытмы юнацтва» ДК прафтэхадукацыі стала лаўрэатам гарадскога конкурсу танцавальных праграм дыскатэк, нядрэнна працуе клуб «Эксперымент» НДІ ПФП БДУ імя У. І. Леніна.

Разам з тым не ўсе магчымасці выкарыстоўваюцца правільна. Сярэдняе наведванне бібліятэк не перавышае 38 працэнтаў. Моладзь аддае перавагу літаратуры так называемых «лёгкіх жанраў» і амаль не цікавіцца класікай.

Неабходна неадкладна навесці парадак і ў праграмах дыскатэк, вакальна-інструментальных ансамбляў, у рэпертуары якіх ёсць нямала нізкапробных твораў.

Мала ў нас у раёне духавых аркестраў, народных хораў, танцавальных калектываў.

Больш увагі патрэбна ўдзяляць і гуртковай рабоце з дзецьмі і падлеткамі, народнай творчасці моладзі.

Паўсядзённых клопатаў патрабуе стан работы ў маладзёжных інтэрнатах. У 27 інтэрнатах пражывае звыш 17 тысяч юнакоў і дзяўчат. Многія з іх, напрыклад, фабрыкі імя Куйбышава, МВАА «Прамень» сталі сапраўды другім домам для моладзі. Але нямала і такіх інтэрнатаў, дзе не праводзіцца ніякай работы, бяздзейнічаюць грамадскія саветы, у выніку ў інтэрнатах няўтульна, у пакоях арганізуюцца п'янкі. Мірыцца з гэтым нельга. Інтэрнат павінен стаць прадметам пастаянных клопатаў кіраўнікоў прадпрыемстваў і устаноў.

Асобна хацелася б спыніцца на ажыццяўленні школьнай рэформы. Галоўнае яе пытанне — удасканаленне падрыхтоўкі юных грамадзян да жыцця і працы. У саюзе з базавымі прадпрыемствамі школе неабходна дабівацца, каб на ўсіх ступенях фарміравання асобы склалася дакладная сістэма працоўнага выхавання і прафарыентацыі. Каб цалкам выканаць гэту задачу, патрэбна дадаткова на прадпрыемствах раёна стварыць 300 рабочых месц, забяспечыць выпуск карыснай прадукцыі не толькі на вытворчасці, але і непасрэдна ў школах і ВВК. Працоўныя калектывы разам са школамі нясуць адказнасць і за ўмацаванне матэрыяльнай базы, і за выхаванне падрастаючага пакалення.

У працоўным навучанні і выхаванні падрастаючага пакалення само жыццё ставіць задачу аб'яднаць намаганні калектываў школ і прафтэхвучылішчаў. Калі ў апошнія гады ў нас паявіліся пазітыўныя зрухі ў камплектаванні ГПТВ, што даюць сярэднюю адукацыю, то гэтага нельга сказаць аб накіраванні выпускнікоў 10-х класаў у тэхнічныя вучылішчы, план набору ў якіх выкананы на 70—80 працэнтаў.

Сёння патрэбна ўдасканальваць і практыку работы вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў. У цэлым ВНУ і тэхнікумы нядрэнна спраўляюцца са сваімі задачамі. Але ёсць і недахопы. Яшчэ даволі многа маладых спецыялістаў і рабочых не едуць працаваць па месцу размеркавання. За вялікай колькасцю студэнтаў і навучэнцаў педагогі, камсамольскія арганізацыі часта не бачаць канкрэтных маладых людзей, не ведаюць, чым яны жывуць, што думаюць.

Сёння стаіць задача больш эфектыўна ўздзейнічаць на моладзь, палепшыць працоўнае выхаванне, фарміраваць яе разумныя інтарэсы.

Дабіваючыся выкаранення параднасці і шуміхі ў камсамольскай рабоце, як гэтага патрабуе пастанова ЦК КПСС, неабходна вызначыць для камсамольскіх арганізацый рэальныя канкрэтныя справы, строга, сістэматычна правяраць іх выкананне. Работа гэта паўсядзённая, патрабуе ўвагі ўсіх.

# ДЫЯЛЕКТЫКА ПОСПЕХУ

**Поспех любой справы вызначаецца шэрагам фактараў. Адной з неабходных умоў дасягнення поспеху з'яўляецца згуртаванасць калектыву, мабілізаванага на вырашэнне канкрэтна пастаўленай задачы. Калектыў здольны паспяхова працаваць тады, калі ў канчатковым выніку зацікаўлены ўсе яго члены. .**

Паспрабуем прааналізаваць дзейнасць камсамольскай арганізацыі акадэмічнай групы. Спынімся на тым, як будуецца яе работа.

Зараз работа ў акадэмічных групах вядзецца па самых розных напрамках, пачынаючы ад пытанняў паспяховасці, наведвання лекцый і канчаючы пытаннямі інтэрнацыянальнага і працоўнага выхавання. Такім чынам, работа групавога бюро накіравана на выхаванне ўсебакова развітой асобы. На практыцы ж часта атрымліваецца, што працуюць толькі некалькі чалавек, астатнім жа адводзіцца роля выканаўцаў. А так як многія мерапрыемствы носяць часовы характар і вызначаюцца толькі рамкамі групы, то гэта прыводзіць да таго, што студэнты замыкаюцца ўнутры свайго маленькага калектыву. Так губляецца галоўная перспектыва ў рабоце групы — выхаванне ўмелага арганізатара, які валодаў бы высокім узроўнем прафесійных ведаў і навыкамі выкарыстання іх на практыцы. Аб гэтым галоўным мы часта забываем.

Апраўдана правядзенне вялікай колькасці мерапрыемстваў на першых курсах. Гэта дае магчымасць уцягнуць учарашняга абітурыента ў гушчыню студэнцкага жыцця, дапамагае вызначыць кожнаму цікавы занятак з улікам здольнасцей. Але на другім-трэцім курсах аказваецца, што для студэнтаў недастаткова групавых мерапрыемстваў, патрэбна сур'ёзная справа з самастойным выхадам у большую аўдыторыю, справа, якая б садзейнічала развіццю прафесійных навыкаў, была яшчэ адным крокам у пакарэнні вышынь прафесійнага майстэрства. Псіхалагічна студэнты старэйшых курсаў гатовы да больш сур'ёзнай работы, а мы дрэнна ўлічваем гэтыя асаблівасці і патрабуем ад іх таго ж, чаго і ад студэнтаў першых курсаў. Гэта адна з нашых памылак, якая паўтараецца з году ў год.

Час пагаварыць аб тым, як мы выходзім з гэтага становішча. У мінулым годзе мы шмат спрачаліся аб тым, як ажывіць камсамольскую работу ў акадэмічных групах. На адным з пасяджэнняў камітэта камсамола было пастаўлена пытанне аб ролі камсамольскай арганізацыі акадэмічнай групы ў камуністычным выхаванні. Доўга спрачаліся і прыйшлі да вываду, што не кожная група стала ў нас калектывам. Часта гэта асобныя людзі, якія воляю абставін аказаліся разам. Садзейнічае згуртаванню групы агульная справа, праводзімыя разам мерапрыемствы, дух спаборніцтва з іншымі калектывамі. І таму не выпадкова ў пастанове запісана, што неабходна правядзенне пэўнай работы ў групах для таго, каб вызначыць інтарэсы студэнтаў і на аснове гэтага даць ім калектыўнае даручэнне.

Гадавая практыка паказала, што замацаванне за групамі калектыўнага даручэння — справа патрэбная і бясспрэчна прынясе поспех. Хацелася б асобна адзначыць групы, якія найбольш паспяхова справіліся з яго выкананнем. Гэта 4-я група II курса аддзялення рускай мовы і літаратуры (камсорг В. Макаленка), 5-я група II курса аддзялення беларускай і рускай мовы і літаратуры (камсорг Н. Хоміч), 5-я група III курса гэтага ж аддзялення (камсорг Н. Хрыпач).

Чацвёртая група працавала ў саставе педатрада ў дзіцячым доме № 3. Работа была арганізавана такім чынам, што кожны студэнт быў уключаны ў актыўную дзейнасць педатрада. Яна насіла штодзённы характар, і студэнты сталі не гасцямі, а пастаяннымі работнікамі. Поспех справы часткова быў забяспечаны тым, што работа давала магчымасць пераканацца ў правільнасці выбару сваёй прафесіі. І ў гэтым навучальным годзе яны без напамінку камітэта камсамола пайшлі ў дзіцячы дом, дзе чакалі іх падросшыя за лета дзеці.

5-я група III курса аддзялення беларускай і рускай мовы і літаратуры амаль у поўным саставе выехала ў будатрад. І хаця некаторыя з іх мелі магчымасць папрацаваць у выязным атрадзе, яны ўсё ж паехалі з групай на цагельны завод у Лагойскі раён, а камсорг групы Н. Хрыпач стаў камісарам атрада. Мара студэнтаў—на наступны год паехаць усёй групай на практыку ў піянерскі лагер. У чым сакрэт такой згуртаванасці? Перш за ўсё ў аўтарытэце камсорга, і ў тым, што група ўзяла сабе цяжкую, але патрэбную справу з дакладна вызначаным канчатковым вынікам. Студэнты ўвачавідкі пераканаліся: разам яны змогуць зрабіць многае.

У заключэнне застаецца пажадаць камітэту камсамола універсітэта, каб пры планаванні работы больш улічвалася спецыфіка кожнага факультэта і ў сувязі з гэтым больш канкрэтна вызначаліся асноўныя напрамкі дзейнасці. Ад даручэнняў групам час пераходзіць да даручэнняў факультэтам, але абавязкова з улікам іх профілю.

**І. КРЭТОВІЧ,**
**сакратар камітэта камсамола філалагічнага факультэта.**





# ТАК ТРЫМАЦЬ!

Чацвёрты раз выступала ў Кішынёве каманда біёлагаў БДУ імя У. І. Леніна — удзельніца III тура Усесаюзнай алімпіяды «Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс» і ўжо другі год займае першае месца сярод універсітэтаў краіны.

У саставе каманды былі два студэнты V курса біяфака Усевалад Монці і Аляксандр Тарасюк і дзве чацвёртакурсніцы Галіна Вягера і Алена Сарокіна. Перад выступленнем яны, безумоўна, хваляваліся. Хацелася як мага лепш абараніць гонар свайго факультэта, падтрымаць традыцыю паспяховых выступленняў нашых каманд у мінулыя гады.

У конкурсе ўдзельнічалі каманды 14 рэспублік (не прыехалі толькі студэнты Грузіі), каманды Маскоўскага і Ленінградскага універсітэтаў. Пытанні, што даваліся студэнтам, адбіраліся журы алімпіяды непасрэдна перад пачаткам конкурсу з заданняў, прывезеных прадстаўнікамі ўсіх каманд. Пытанні і заданні сапраўды алімпійскія. Неабходна не проста ведаць, важна здолець хутка і аптымальна знайсці комплекснае рашэнне, выкарыстаць самыя нечаканыя звесткі і факты з розных галін біялогіі, хіміі, фізікі, матэматыкі, усё гэта лагічна асэнсаваць і дакладна выкласці.

А побач 70 сапернікаў, пераможцаў рэспубліканскіх тураў алімпіяды. Сабраліся лепшыя з лепшых. Прыемна адзначыць, што нашы студэнты не разгубіліся. Практычна на ўсе пытанні адказалі добра, працавалі ўважліва.

Калі пасля заканчэння работы я сустрэла іх, было відаць, што яны стаміліся, яшчэ не спала напружанне, але было зразумела, што з заданнямі справіліся. На пытанне: «Як напісалі?» адказалі па-рознаму. Сева Монцік: «Не вельмі, але быццам усё». Саша Тарасюк: «Здаецца, усё». Галя Вягера: «Здаецца, нармальна». Алена Сарокіна: «На нейкі момант разгубілася, магла б лепш». Гэта ўражанні студэнтаў. І вось заключнае пасяджэнне журы, ідзе расшыфроўка работ удзельнікаў конкурсу.

Лепшы вынік — 44 балы з 50—Усевалад Монцік, другі — 40 балаў — Аляксандр Тарасюк, чацвёрты — 39 балаў — Галіна Вягера. Толькі на 8 балаў адстала Алена Сарокіна — 31 бал.

Такой зладжанай каманды не прадставіла ніводная рэспубліка. Аб гэтым сказаў на ўрачыстым закрыцці III тура алімпіяды кіраўнік каманды Ленінградскага універсітэта, гэта адзначыла журы.

Нечаканы і вельмі прыемны сюрпрыз выкладчыцкаму калектыву біяфака зрабіў адзін са студэнтаў Кішынёўскага універсітэта. Праводзячы нас у аэрапорт, ён сказаў, што размова з нашымі студэнтамі паказала, што на біяфаку БДУ вучаць думаць, абагульняць веды, аналізаваць. Бясспрэчна, гэта адна з важнейшых задач усяго працэсу падрыхтоўкі спецыялістаў з універсітэцкай адукацыяй. Іменна да гэтага і імкнецца кожны педагог.

Патрэбна адзначыць, што лаўрэатам алімпіяды стаў студэнт 5-га курса Усевалад Монцік, другое месца заняў Аляксандр Тарасюк, чацвёртае — Галіна Вягера.

Хочацца яшчэ раз ад душы павіншаваць студэнтаў з цудоўнай, упэўненай перамогай і пажадаць ім вялікіх творчых поспехаў у вучобе, у будучай рабоце, у авалоданні адной з самых цудоўных галін ведаў — навукай аб жыцці — біялогіяй.

**М. МАРОЗІК,**
**намеснік дэкана біялагічнага факультэта;**
**Е. ШАЛАПЁНАК,**
**кіраўнік каманды.**

**НА ЗДЫМКУ:** пераможцы алімпіяды.

Фота А. Валошына.



«Зімні» дуб. Фота С. Плыткевіча.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

29 лістапада 1984 г.

Зак. 1903. АТ 10560.

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар

В. П. ВАРАБ'ЁЎ